Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
_________________ А.І.Жук
“_____“_____________2024 г.
Рэгістрацыйны № УД-_________/вуч.

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ (1939 г. – першая чвэрць XXI ст.)**

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:

1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны,
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура,
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе агульнаадукацыйных стандартаў і вучэбных планаў спецыяльнасцей: 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны (№ 016-2021/у ад 15.07.2021); 1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура (№ 017-2021/у ад 15.07.2021); 1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа (№ 018-2021/у ад 15.07.2021)

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Н.В.Барабаш, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:

П.А.Трубчык, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
В.А.Йоцюс, загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Намеснік дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі
«Гімназія № 40 імя Я.Лучыны г. Мінска» А.У.Цішчанка

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў
(пратакол № 8 ад 26.03.2024).
Загадчык кафедры С.А.Талмачова

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № ______ад ______ ______2024).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ А.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя Беларусі (1939 г. – першая чвэрць XXI ст.)” прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі па спецыяльнасцям: 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, 1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура; 1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа.

**Мэтай вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца –** фарміраванне фундаментальных ведаў аб асноўных заканамернасцях развіцця сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных, нацыянальна-культурных працэсаў у Беларусі ў 1939 г. – першай чвэрці XXI ст. і выхаванне на гэтай аснове пачуцця гонару, годнасці, адказнасці і працы на карысць сваёй Радзімы; фарміраванне ўменняў ажыццяўлення самастойнай даследчай дзейнасці ва ўмовах інавацыйнага адукацыйнага асяроддзя.

Для рэалізацыі вызначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных задач:

1) высвятленне прычынна-выніковых сувязей і заканамернасцей гістарычнага развіцця беларускага народа ў кантэксце славянскай, еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

2) усведамленне студэнтамі матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцей беларускага народа, якія служаць асновай для аналізу сучаснасці і вызначэння перспектыў будучага развіцця краіны;

3). атрыманне тэарэтычных і практычных ведаў, якія дазволяць студэнтам навукова, абгрунтавана і ўсебакова аналізаваць падзеі і факты гісторыі, рабіць неабходныя высновы і абагульненні;

4) фарміраванне навуковага катэгарыяльнага і панятыйнага апарата па вучэбнай дысцыпліне;

5) фарміраванне гатоўнасці выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, спрыяць далейшаму ўстойліваму і стабільнаму функцыяванню беларускай мадэлі развіцця сваей краіны.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй**

Дадзеная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя Беларусі (1939 г. – першая чвэрць XXI ст.)” распрацавана на аснове прынцыпу пераемнасці з вучэбнымі праграмамі вучэбных дысцыплін “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці”, “Гісторыя Расіі і Украіны (1945 г. – першая чвэрць XXI ст.)”, “Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі” для агульнай вышэйшай адукацыі і грунтуецца на кампетэнцыях, сфармаваных у студэнтаў у працэсе іх вывучэння.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– асноўныя падзеі і факты гісторыі Беларусі ў 1939 г. – першай чвэрці XXI ст.;

– асаблівасці сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі ў 1939 г. – XXI ст.;

– асноўныя этапы развіцця, захавання і ўмацавання беларускай

дзяржаўнасці і разуменне яе асаблівасцей з 1939 г. па цяперашні час.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **умець:**

– выкарыстоўваць метадалогію гістарычнай навукі для аналізу гістарычнага развіцця беларускага народа;

– прымяняць атрыманыя веды ў працэсе выкладання гісторыі Беларусі ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе;

– выкарыстоўваць гістарычны вопыт для аналізу і ацэнкі сучасных праблем у развіцці суверэннай Рэспублікі Беларусь.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **валодаць:**

– спосабамі адбору і сістэматызацыі гістарычнай інфармацыі;

– метадамі і формамі вучэбна-даследчай дзейнасці, а таксама камунікатыўнымі тэхналогіямі (дыскусія, прэс-канферэнцыя, навучальныя дэбаты і іншымі).

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя Беларусі (1939 г. – першая чвэрць XXI ст.)" павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных кампетэнцый:

УК-7. Валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі патрыятызму і грамадскасці, разумення сацыяльнай значнасці будучай прафесійнай дзейнасці;

БПК. Выдзяляць асноўныя перыяды, тэндэнцыі і заканамернасці сацыяльных, эканамічных, палітычных, этна-нацыянальных, рэлігійна-канфесіянальных і культурных падзей і працэсаў, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя Беларусі (1939 г. – першая чвэрць XXI ст.)" вучэбным планам адводзіцца: – на дзённай форме атрымання адукацыі ўсяго 120 гадзін, у тым ліку 56 аўдыторных гадзін, з іх: лекцыі – 24 гадзіны, семінарскія заняткі – 32 гадзіны (кіруемая самастойная работа – 10 гадзін семінарскія заняткі). На самостойную работу адводзіцца 64 гадзіны. Форма кантролю – экзамен ў 7 семестры.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

На завочнай форме атрымання адукацыі вучэбнам планам адводзіцца 120 гадзін (3 заліковыя адзінкі), з іх аудыторных 14 гадзін (лекцыі – 6 гадзін; семінарскія заняткі – 8 гадзін), на самастойную работу адводзіцца 106 гадзін. Форма кантролю – экзамен на 4 курсе (8 семестр).

Для кіравання навучальным працэсам і кантролю за засваеннем ведаў студэнтамі выкарыстоўваецца рэйтынгавая сістэма ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, розныя формы самастойнай працы, вучэбна-метадычны комплекс.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войн 1939–1945 гг.

### Тэма 1.1. Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР

Гістарыяграфія пытання. Савецка-германскі дагавор 1939 г., сакрэтныя пратаколы да яго. Пачатак Другой сусветнай вайны. Напад фашысцкай Германіі на Польшчу, разгром польскай дзяржавы. Ваенныя дзеянні на беларускай тэрыторыі.

Уступленне Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь. Адносіны насельніцтва да прыходу Чырвонай арміі. Лёс польскіх ваенных, якія апынуліся ў савецкім палоне.

Пачатак усталявання савецкай улады ў Заходняй Беларусі і стварэнне часовых органаў улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Стварэнне органаў КП(б)Б, забарона дзейнасці польскіх палітычных партый, грамадскіх аб’яднанняў і саюзаў.

Падрыхтоўка і выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі. Рашэнні Народнага сходу, III сесіі Вярхоўнага Савета БССР аб уз’яднанні Заходняй Беларусі з БССР, іх роля і значэнне ў нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве БССР.

Павелічэнне тэрыторыі і насельніцтва БССР. Перадача часткі беларускіх зямель Літве. Выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР і БССР. Нацыяналізацыя прыватнага сектара ў эканоміцы, сельскай гаспадарцы і фінансах. Пачатак стварэння калгасна-саўгаснай сістэмы. Змены ў нацыянальна-культурным, адукацыйным, рэлігійным жыцці. Станаўленне польскага антысавецкага ваеннага падполля і яго барацьба супраць савецкай улады. Дэпартацыі польскага насельніцтва з Заходняй Беларусі.

### Тэма 1.2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі ў Беларусі летам 1941 г.

СССР у перадваенныя гады. Мерапрыемствы па ўмацаванню абароназдольнасці краіны. Ваенна-патрыятычная і ваенна-абарончая работа сярод насельніцтва. Узброеныя сілы Савецкага Саюза. Заходняя асобая ваенная акруга.

Мэты Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза. План “Маланкавай вайны”. Напад Германіі на СССР. Прыгранічныя баі ў Беларусі. Абарона Брэсцкай крэпасці. Абарончыя баі пад Мінскам, Бабруйскам, Оршай, Віцебскам, Магілёвам і Гомелем. Магілеўская бітва. Гераізм і мужнасць савецкіх воінаў. Прычыны паражэнняў Чырвонай Арміі летам-восенню 1941 г.

Дзейнасць савецкіх і партыйных органаў па мабілізацыі сіл і сродкаў для барацьбы з агрэсарам. Дзяржаўны камітэт абароны (ДКА). Перавод прамысловасці на ваенныя рэйкі. Эвакуацыя насельніцтва, матэрыяльных і

культурных каштоўнасцей з БССР у тылавыя раёны СССР.

**Тэма 1.3. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.**

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел акупаванай тэрыторыі: Генеральная акруга Беларусь, Генеральныя акругі Валынь, Падолія і Жытомір, Генеральная акруга Беласток, Генеральная акруга Літва, вобласць армейскага тылу групы армій “Цэнтр”.

Акупацыйны апарат кіравання. Склад і структура. Генеральны камісарыят Беларусі, абласныя і мясцовыя камісарыяты, раённыя і валасныя ўправы. Дапаможныя акупацыйныя органы кіравання.

Мэты акупацыйнай палітыкі. Устанаўленне акупацыйнага рэжыму – “Новы парадак”. Сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя мерапрыемствы нямецкіх акупантаў. Рабаванне гітлераўцамі матэрыяльных і культурных каштоўнасцей.

**1.4. Палітыка генацыду на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.**

Абгрунтаванне і планы фашысцкай Германіі адносна славянскага насельніцтва на акупаваных тэрыторыях СССР. План “Ост”. Планы нацысцкай Германіі па ажыццяўленні генацыду беларускага народа. Канвенцыя ААН “Аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго” (9 снежня 1948 г.). Юрыдычна-прававы статус паняцця “генацыд”. Крымінальная справа па факце генацыду насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (2021 г.).

Метады і сродкі масавага знішчэння людзей. Хатынь. Вогненныя сёстры Хатыні. Масавае знішчэнне насельніцтва і ваеннапалонных. Найбуйнейшыя лагеры смерці і гібелі грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі. Генацыд яўрэйскага насельніцтва. Гета. Халакост. Масавы вываз грамадзянскага насельніцтва БССР у Германію для прымусовай працы. Маштабны адбор і адпраўка ў Германію рэсурсаў, знішчэнне дзяржаўнай маёмасці і асабістай маёмасці грамадзянскага насельніцтва.

Тэрмін “калабарацыянізм” ў сучаснай гістарыяграфіі. Асноўныя калабарацыяніcцкія фарміраванні на акупаванай тэрыторыі Беларусі і іх дзейнасць у адносінах да мірнага насельніцтва. Латышскія, літоўскія, украінскія і іншыя калабарацыяніcцкія фарміраванні. Крывавыя карныя аперацыі супраць партызан, падпольшчыкаў і мірнага насельніцтва.

Пакаранне ваенных злачынцаў пасля Вялікай Айчыннай вайны. Матэрыялы надзвычайнай Дзяржаўнай камісіі па ўсталяванні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў. Расследаванне Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь крымінальнай справы па фактах здзяйснення нацысцкімі злачынцамі, іх саўдзельнікамі, злачыннымі фарміраваннямі генацыду мірнага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адкрытыя судовыя працэсы ў Беларусі над нямецкімі ваеннымі злачынцамі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Бабруйску.

**Тэма 1.5. Усенародная барацьба супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Партызанскі і падпольны рух**

Разгортванне барацьбы супраць нямецкіх войскаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Першыя партызанскія атрады і падпольныя антыфашысцкія камітэты і групы. Дзейнасць КП(б)Б ва ўмовах акупацыі. Стварэнне сеткі падпольных партыйных і камсамольскіх органаў і арганізацый. Мінскае падполле. Падпольныя арганізацыі і барацьба з акупантамі ў Магілёве, Віцебску, Оршы, Скідзелі, іншых раёнах Беларусі. Антыфашысцкія патрыятычныя арганізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Супраціўленне ў гета. Уплыў ваенных падзей на ваенна-палітычнае становішча ў Беларусі. Партызанскія брыгады, іх баявая дзейнасць.

Стварэнне і роля Цэнтральнага і Беларускага штаба партызанскага руху (ЦШПР і БШПР). Арганізацыйная структура партызанскага руху. Партызанскія зоны. Рэйды партызанскіх фарміраванняў.

“Рэйкавая вайна”. Дапамога савецкага тылу і мясцовага насельніцтва партызанам і падпольшчыкам. Узаемаадносіны мірнага насельніцтва і партызан. Асаблівасці антыфашысцкай барацьбы ў Заходняй Беларусі. Армія Краёва ў Беларусі: мэты, тактыка, дзейнасць, узаемаадносіны з савецкімі партызанамі. Вызваленне Беларусі.

**Тэма 1.6. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войн**

Перадумовы карэннага пералому ў Вялікай Айчыннай вайне. Сталінградская і Курская бітвы. Пачатак вызвалення тэрыторыі Беларусі ў канцы 1943 – пачатку 1944 г. Сумесныя дзеянні партызан і часцей Чырвонай арміі.

Ваена-стратэгічная наступальная аперацыя “Баграціён”. Акружэнне і разгром фашысцкіх войскаў пад Віцебскам, Бабруйскам, Мінскам. Вызваленне Мінска, усёй тэрыторыі БССР ад нямецкіх захопнікаў. Значэнне разгрому гітлераўскіх войскаў у Беларусі. Удзел беларускага народа ў разгроме фашысцкай Германіі і Японіі. Беларусы на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у еўрапейскім руху Супраціўлення. Эвакуіраваныя жыхары Беларусі ў савецкім тыле. Людскія, матэрыяльныя і культурныя страты Беларусі ў час Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай вайны.

**Раздзел 2. БССР у пасляваенный перыяд (1945–1985 гг.)**

**Тэма 2.1. БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе**

Аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі пасля Вялікай Айчыннай вайны. Пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР 1946–1950 гг. Стварэнне новых галін прамысловасці. Апераджальны рост цяжкай прамысловасці. Адміністрацыйна-камандная сістэма кіравання прамысловасцю і сельскай гаспадаркай.

Аднаўленне калгасна-саўгаснай сістэмы, МТС. Калектывізацыя ў

заходніх абласцях БССР. Аднаўленне дзейнасці партыйных, савецкіх органаў і грамадскіх арганізацый пасля вайны. Падпольныя арганізацыі беларускай моладзі. Антысавецкая барацьба і бандытызм.

Грамадска-палітычнае становішча. Выбары ў Вярхоўны Савет СССР (1946 г.), Выбары ў Вярхоўны Савет БССР (1947 г.) і мясцовыя Саветы рэспублікі (1948 г.) Узмацненне адміністрацыйна-каманднай сістэмы, культа асобы Сталіна і ідэалагічнага націску. Рэпрэсіі ў пасляваенныя гады. Матэрыяльнае становішча насельніцтва БССР. Адмена картачнай сістэмы ў БССР і грашовая рэформа (1947 г.).

**Тэма 2.2. Дзейнасць БССР у ААН і сусветных міжнародных арганізацыях у першае пасляваенае дзесяцігоддзе**

Выхад БССР на міжнародную арэну. Стварэнне Наркамата замежных спраў (1944 г.), Міністэрства замежных спраў (МЗС) БССР (1946 г.). Пашырэнне паўнамоцтваў рэспублікі ў галіне знешніх зносін. БССР – адна з краін-заснавальніц ААН. Удзел Беларусі ў дзейнасці міжнародных арганізацый і ўстаноў.

Дзейнасць прадстаўніцтва БССР у ААН. Гандлёва-эканамічныя сувязі з капіталістычнымі краінамі. Гандлёвыя, эканамічныя і культурныя сувязі з сацыялістычнымі краінамі Еўропы.

Культурны і навуковы абмен. Супрацоўніцтва ў галіне спорта і турызму. Умовы развіцця замежных сувязей.

**Тэма 2.3. Грамадска-палітычнае развіццё ў БССР у другой палове 1950-х –другой палове 1960-х гг.**

Смерць І.В. Сталіна і барацьба за палітычную ўладу ў СССР. ХХ з’езд КПСС (1956 г.) і перамены ў грамадска-палітычным жыцці. Спробы дэцэнтралізацыі і дэбюракратызацыі дзяржаўнага механізму. Пашырэнне правоў Беларускай ССР у дзяржаўным кіраванні. Савецкая грамадска-палітычная сістэма: К.Мазураў, П.Машэраў. Актывізацыя дзейнасці і ўзмацненне ролі Саветаў. Узмацненне кіруючай ролі КПСС – КПБ.

Першыя спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця пасля смерці І.В. Сталіна. Спробы дэмакратызацыі грамадскага жыцця. Рэабілітацыя ахвяр культу асобы. Дзейнасць прафсаюзаў, маладзёжных і іншых грамадскіх арганізацый і аб’яднанняў.

Культурнае жыццё рэспублікі. Пераход да абавязковай васьмігадовай і ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Адкрыццё ў рэспубліцы новых навучальных устаноў. Пашырэнне ўніверсітэцкай адукацыі, асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў. Галоўныя дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры і мастацтва. Абмежаванасць нацыянальна-культурнага жыцця ў Беларусі. Выцясненне беларускай мовы са сферы адукацыі, навукі і друку. Прычыны духоўнага крызісу грамадства і яго сацыяльна-псіхалагічныя вынікі.

**Тэма 2.4. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг.**

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Асноўныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця рэспублікі ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (НТР). Асаблівасці навукова-тэхнічнага прагрэсу (НТП) у Беларусі. Структура прамысловасці. Стварэнне новых галін вытворчасці. Уплыў ваенна-прамысловага комплексу на тэхнічны прагрэс. Пагаршэнне экалагічнай абстаноўкі.

Спробы эканамічных рэформ. Пераход ад галіновага да тэрытарыяльнага кіравання. Становішча ў сельскай гаспадарцы рэспублікі. Спробы рэфармавання сельскай гаспадаркі. Асваенне цалінных і абложных зямель. Стварэнне сельскагаспадарчых комплексаў.

**Тэма 2.5. БССР у 1970-я – першай палове 1980-х гг. Нарастанне крызісных з'яў**

Грамадска-палітычнае развшццё ў 1970-я гг. Канцэпцыя развітога сацыялізму. Канстытуцыя СССР (1977 г.). Паніжэнне ролі Саветаў. Канстытуцыя БССР (1978 г.).

Развіццё прамысловасці, транспарту і сувязі. Нарастанне крызісных з'яў у грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці СССР. Прычыны спаду тэмпаў эканамічнага росту. Экстэнсіўны шлях развіцця эканомікі БССР. Рост грашовых даходаў, паляпшэнне матэрыяльнага дабрабыту ва ўмовах зніжэння тэмпаў эканамічнага росту. Дэфіцыт тавараў першай неабходнасці.

Супярэчнасці і складанасці ў развіцці сельскай гаспадаркі. Абвастрэнне харчовай праблемы. Харчовая праграма 1982 г. Матэрыяльнае становішча насельніцтва БССР.

**Тэма 2.6. БССР ва ўмовах палітыкі перабудовы. Другая палова 1980-х – пачатак 1990-х гг.**

Прыход да ўлады ў 1985 г. М.С.Гарбачова. Палітыка перабудовы, яе змест і накірункі ажыццяўлення. Дэмакратызацыя грамадства. Палітыка галоснасці. Курс на паскоранае развіццё сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Рост нацыянальных рухаў. Узмацненне сепаратысцкіх тэндэнцый. Рэферэндум (1991). Новаагароўскі працэс. Жнівеньскія падзеі 1991 г. у Маскве і іх уплыў на становішча ў Беларусі. Адстаўка М. С. Гарбачова.

Распад СССР і яго вынікі для сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця Беларусі. Розныя погляды і меркаванні на палітыку перабудовы.

**Тэма 2.7. Грамадска-палітычнае развіццё БССР ва ўмовах палітыкі перабудовы**

Грамадска-палітычнае развіццё Беларусі ў перыяд перабудовы. Узрастанне ролі саветаў, выбары народных дэпутатаў. Заканадаўчая

дзейнасць Вярхоўнага Савета БССР. Рэфарміраванне савецкай палітычнай сістэмы.

Адмена 6-га артыкула Канстытуцыі СССР. Фарміраванне шматпартыйнай сістэмы і палітычнага плюралізму. Фарміраванне палітычнай апазіцыі. Узнікненне новых палітычных партый і рухаў, грамадскіх арганізацый. Страта КПБ манаполіі на ўладу. Выбары ў рэспубліканскія і мясцовыя органы ўлады (1990 г.).

Дзейнасць Вярхоўнага Савета БССР. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце (27 ліпеня 1990 г.). Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі (1991 г.). Белавежскае пагадненне аб дэнансацыі саюзнага дагавора і стварэнні Садружнасці незалежных дзяржаў (СНД).

## Раздзел 3. Суверэнная Рэспубліка Беларусьў канцы XX – пачатку XXI ст.

### Тэма 3.1. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь

Неабходнасць кардынальных змен, пошукі шляхоў іх ажыццяўлення. Асаблівасці і цяжкасці ажыццяўлення эканамічных рэформ, пераходу да рынкавых адносін. Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы для рэспублікі. Станаўленне розных форм уласнасці і гаспадарання. Цяжкасці і супярэчнасці ў сацыяльна-эканамічным развіцці ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў. Распрацоўка праграмы пераходу да рынкавых адносін. Рынкавыя рэформы ў 1992–1994 гг. Непаслядоўнасць рэформ. Скарачэнне выпуску прамысловай прадукцыі, пагаршэнне становішча сельскай гаспадаркі. Абвастрэнне эканамічнага крызісу. Заняпад у сацыяльнай сферы.

### Тэма 3.2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь ў другой палове 1990-х - пачатку 2000-х гг.

Распрацоўка і прыняцце праграмы неадкладных мер па вываду эканомікі рэспублікі з крызісу пасля абрання А.Р.Лукашэнкі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у 1994 г. Прыняцце першым Усебеларускім народным сходам (кастрычнік 1996 г.) “Асноўных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гады”. Рэалізацыя распрацаваных мерапрыемстваў, іх вынікі. Пераадоленне крызісных тэндэнцый у эканоміцы ў другой палове 1990-х гадоў. Пераход ад спаду да развіцця эканомікі, стабілізацыі эканамічнага росту. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага эканамічнага развіцця краіны. Станаўленне беларускай мадэлі сацыяльна-арыентаванай рыначнай эканомікі.

### Тэма 3.3. Развіццё Беларусі ва ўмовах незалежнасці і суверэнітэту

Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР (27 ліпеня 1990 г.). Асноўныя этапы афармлення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Наданне Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце

Беларускай ССР статуса канстытуцыйнага закона (25 жніўня 1991 г.). Прыняцце Закона “Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР (26 жніўня 1991 г.). Зацвярджэнне назвы – Рэспубліка Беларусь і яе дзяржаўных сімвалаў (19 верасня 1991 г.). Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (15 сакавіка 1994 г.).

Эвалюцыя грамадска-палітычнай сістэмы Беларусі. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь – А.Р.Лукашэнка.

Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы. Дзяржаўная маладзёжная палітыка. Палітыка ў сферы рэлігій.

**Тэма 3.4. Грамадска-палітычная сістэма Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе**

Станаўленне і развіццё прэзідэнцкай сістэмы ўлады. Рэспубліканскі рэфэрэндум 14 мая 1995 г.

Рэспубліканскі рэферэндум у лістападзе 1996 г. Прыняцце новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1996 г.). Рэспубліка Беларусь – унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава.

Другі Усебеларускі народны сход 18 мая 2001 г. Прэзідэнцкія выбары 2001 г. Перадвыбарная праграма А.Р. Лукашэнкі і яго перамога на выбарах. Рэспубліканскі рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. Выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.

Трэці Усебеларускі народны сход 2–3 сакавіка 2006 г. Выбары Пррэзідэнта Рэспублікі Беларусь 19 сакавіка 2006 г. Чацвёрты Усебеларускі сход 6–7 снежня 2010 г. Прыярытэтныя накірункі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011–2025 гг. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2020 г. Рэферэндум 2022 г.

**Тэма 3.5. Палітычныя партыі, аб’яднанні і саюзы ў грамадска-палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь**

Пераход ад аднапартыйнай сістэмы да шматпартыйнасці. Нарматыўна-прававая база дзейнасці партый і грамадскіх аб’яднанняў. Тыпалагізацыі палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў у Рэспубліцы Беларусь. Іх роля ў развіцці грамадства і дзяржавы. Камуністычная партыя Беларусі (КПБ), “Белая Русь” – ад грамадскага аб’яднання да паалітычнай партыі, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі і інш. Роля і месца палітычных партый, грамадскіх аб’яднанняў і саюзаў у грамадска-палітычным жыцці Беларусі.

**Тэма 3.6. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь ва ўмовах міравых глабалізацыйных працэсаў**

Пачатак новага этапу ў знешнепалітычнай і міжнароднай дзейнасці Беларусі пасля набыцця ёю дзяржаўнага суверэнітэту. Прызнанне замежнымі краінамі незалежнасці Рэспублікі Беларусь, пашырэнне яе палітычных, эканамічных і культурных сувязей. Развіццё інтэграцыйных працэсаў паміж Беларуссю і Расіяй. Дагавор аб Садружнасці сувярэнных дзяржаў –

Рэспублікі Беларусь і Расійская Федэрацыі 2 красавіка 1996 г. Дамова аб Саюзе Беларусі і Расіі 2 красавіка 1997 г. Фарміраванне Мытнага саюза і адзінай эканамічнай прасторы. Праблемы ўзаемаадносін Беларусі з краінамі Захаду. Развіццё міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва. Выкарыстанне геапалітычнага становішча, эканамічнага і навуковага патэнцыялу Беларусі ў міжнародных эканамічных сувязях.

**Тэма 3.7. Беларусь у еўрапейскай і сусветнай супольнасці**

Актывізацыя ўдзелу Беларусі ў дзейнасці ААН і міжнародных арганізацыях. Пераход да статусу бяз’ядзернай дзяржавы, далучэнне да дагавору аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі. Асноўныя прынцыпы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Рэспубліка Беларусь – нейтральная без’ядзерная дзяржава. Выступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі на сесіях Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб’яднаных нацый (ААН) у 1995 і 2005 гг. Шматвектарнасць знешнепалітычнага курса Беларусі. Курс на далейшае паглыбленне інтэграцыйных працэсаў з Расіяй і ў рамках СНД. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы 8 снежня 1999 г. Утварэнне адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі, Украіны і Казахстана. Рэспубліка Беларусь у інтэграцыйных працэсах на постсавецкай і еўразійскай прасторы ва ўмовах глабалізацыі і нарастання міжнароднага тэрарызму. Рэспубліка Беларусь – раўнапраўны член сусветнай супольнасці.

**Тэма 3.8. Культура ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту**

Духоўнае і культурнае жыццё беларускага народа на мяжы XX–XXI стст. Асэнсаванне гістарычнага мінулага і сучаснасці ў творах літаратуры і мастацтва. Творчасць Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, І. Шамякіна. Музыкальнае мастацтва. Творчасць У. Роўды, М. Дрынеўскага, М. Казінца, М. Фінберга. Свята песні “Славянскі базар”. Статус Нясвіжа як нацыянальнага запаведніка. Полацкі гісторыка-культурны запаведнік. Нацыянальна-культурнае адраджэнне. Далейшае фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі. Месца рэлігіі ў духоўным адраджэнні. Узаемаадносіны дзяржавы і царквы.

**Тэма 3.9. Адукацыя і навука ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту**

Мадэрнізацыя нацыянальнай сістэмы адукацыі. Сістэма адукацыі Рэспублікі Беларусь. Недзяржаўная форма адукацыі. Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця. Закон “Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі” (1993 г.). Роля навукі ў інфармацыйным грамадстве. Першы з’езд вучоных Рэспублікі Беларусь. Сучасныя праблемы беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння. Галоўныя тэндэнцыі і напрамкі развіцця сучаснай навукі. Беларуская навука – магутны інтэлектуальны фактар устойлівага і стабільнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Міжнародныя сувязі вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі з замежнымі навуковымі ўстановамі

# ВУЧЭБНА -МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ (1939 Г. – ПЕРШАЯ ЧВЭРЦЬ XXI СТ.)” (дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва рздзела, тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | | Самастойная (пазааўдыторная) работа | Метадычныя сродкі забяспячэння, дапаможнікі | Літаратура | Форма канторолю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | Кіруемая самастойная работа | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **7 семестр** | **24** | **22** | **10** | **64** | | | |
| 1 | **Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войн 1939–1945 гг.** | **10** | **2** | **6 с.** | | | | |
| 1.1 | **Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР**<br>1. Гістарыяграфія праблемы.<br>2. Вызваленчы паход Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь.<br>3. Стварэнне органаў улады і працэсс аб’яднання беларускага народа ў адзінай дзяржаве.<br>4. Юрыдычна-прававое афармленне ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР. | 2 | | 2 с. | 2 | Дакументальны фільм | [1,2] | Вуснае апытанне |
| 1.2 | **Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі ў Беларусі летам 1941 г.**<br>1. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.<br>2. Напад фашысцкай Германіі на СССР.<br>3. Абарончыя баі ў Беларусі летам 1941 г.<br>4. Мабілізацыя ў РСЧА і эвакуацыя насельніцтва з БССР у тылавыя раёны СССР. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1,2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3 | **Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі 1941-1944 гг.**<br>1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел акупаванай тэрыторыі Беларусі.<br>2. Стварэнне органаў акупацыйнай ўлады.<br>3. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя мерапрыемствы нямецкіх акупантаў. | 2 | | | 4 | Карта “Ваенна-адміністратыўны падзел акупаванай тэрыторыі Беларусі” (1942 г.) | [1,2] | |
| 1.4 | **Палітыка генацыду на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.**<br>1. Абгрунтаванне і планы фашысцкай Германіі адносна славянскага насельніцтва на акупаваных тэрыторыях СССР.<br>2. Формы і метады правядзення палітыкі генацыду на акупаванай тэрыторыі БССР.<br>3. Беларускія калабаранты – памочнікі нямецка-фашысцкіх акупантаў у правядзенні генацыду.<br>4. Адкрытыя судовыя працэсы ў Беларусі над нямецкімі ваеннымі злачынцамі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Бабруйску. | | 2 | | 2 | | [1,2] | Вуснае апытанне |
| 1.5 | **Усенародная барацьба супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Партызанскі і падпольны рух**<br>1. Структура, формы і метады партызанскай барацьбы. Стварэнне ЦШПР, БШПР.<br>2. “Рэйкавая вайна”. Асноўныя этапы і іх характарыстыка.<br>3. Антыфашысцкі падпольны рух на акупаванай тэрыторыі Беларусі. | 2 | | 2 с. | 2 | | [1,2] | Паведамленні |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.6 | **Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войн**<br>1. Заключны этап Другой сусветнай вайны.<br>2. Ваена-стратэгічная наступальная аперацыя “Баграціён”.<br>3.Удзел беларускага народа ў разгроме фашысцкай Германіі і Японіі. | 2 | | 2 с. | 4 | | [1,2] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 (пісьмовая форма правядзення – тэст) |
| 2 | **Раздзел 2. БССР у пасляваенны перыяд (1945–1985 гг.)** | **8** | **8** | **2 с** | | | | |
| 2.1 | **БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе**<br>1. Першы аднаўленчы перыяд у 1943–1945 гг.<br>2. Аднаўленне і развіццё прамысловасці ў БССР у 1946–1955 гг.<br>3. Асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі. Ажыццяўленне калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі ў 1949–1953 гг.<br>4. Грамадска-палітычнае развіццё ў БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг. | 2 | | 2 с. | 4 | Дакументальны фільм | [1,2] | Вуснае апытанне |
| 2.2 | **Дзейнасць БССР у ААН і сусветных міжнародных арганізацыях у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе**<br>1. Выхад БССР на міжнародную арэну. Стварэнне і дзейнасць Міністэрства замежных спраў (МЗС) БССР.<br>2. Асноўныя накірункі знешнепалітычнай дзейнасці БССР у 1945–1955 гг.<br>3. Міжнародныя кантакты БССР у галіне культуры. | | 2 | | 2 | | [1,2] | |
| 2.3 | **Грамадска-палітычнае развіццё ў БССР у другой палове 1950-х–другой палове 1960-х гг.**<br>1. Смерць І. Сталіна і барацьба за палітычную ўладу ў СССР.<br>2. Прыход да ўлады М. Хрушчова. Змест і асноўныя накірункі “хрушчоўскай адлігі”.<br>3. Развіццё культуры ў перыяд “хрушчоўскай адлігі”. | 2 | | | 4 | Дакументальны фільм | [1,2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.4 | **Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1950-х–другой палове 1960-х гг.**<br>1. Сацыяльна- эканамічнае развіццё Беларусі.<br>2. Асаблівасці навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў БССР.<br>3. Развіццё народнай гаспадаркі БССР у 1960-я гг. Гаспадарчая рэформа 1965 г. і яе вынікі. | | 2 | | 4 | | [1,2] | Абарона прэзента цый |
| 2.5 | **БССР у 1970-я–першай палове 1980-х гг. Нарастанне крызісных з'яў**<br>1. Развіццё прамысловасці, транспарту і сувязі<br>2. Супярэчнасці развіцця эканомікі БССР.<br>3. Стан сельскай гаспадаркі. Абастрэнне харчовай праблемы.<br>4. Нарастанне негатыўных з'яў у сацыяльнай сферы. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1,2] | |
| 2.6 | **БССР ва ўмовах палітыкі перабудовы. Другая палова 1980-х – пачатак 1990-х гг.**<br>1. Палітыка перабудовы, яе змест і накірункі ажыццяўлення.<br>2. Спроба дзяржаўнага перавароту ў Маскве ў жніўні 1991 г.<br>3. Распад СССР і яго вынікі для сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця Беларусі. | 2 | 2 | | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1,2] | Вуснае апытанне |
| 2.7 | **Грамадска-палітычнае развіццё Беларусі ў перыяд перабудовы**<br>1. Пераход рэспублікі да шматпартыйнасці і палітычнага плюралізму.<br>2. Роля і месца палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў і саюзаў у грамадска-палітычным жыцці Беларусі.<br>3. Выбары і дзейнасць ВС БССР у перыяд перабудовы. | | 2 | | 4 | | [1,2] | |
| 3 | **Суверэнная Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI ст.** | **6** | **12** | **2 с.** | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.1 | **Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь**<br>1. Праблемы і супярэчнасці сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у канцы 1980-х–пачатку 1990-х гадоў.<br>2. Распрацоўка праграмы пераходу да рынкавых адносін. Непаслядоўнасць і неэфектыўнасць сацыяльна-эканамічных рэформ.<br>3. Абвастрэнне эканамічнага крызісу. Заняпад у сацыяльнай сферы. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1,2] | |
| 3.2 | **Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь у другой палове 1990-х – пачатку 2000-х гг.**<br>1. Распрацоўка і прыняцце праграмы неадкладных мер па вываду эканомікі рэспублікі з крызісу.<br>2. Распрацоўка беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.<br>3. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага эканамічнага развіцця краіны. | | 2 | | 4 | | [1,2] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 (пісьмовая форма правядзення – тэст) |
| 3.3 | **Развіццё Беларусі ва ўмовах незалежнасці і суверэнітэту**<br>1. Абвяшчэнне і заканадаўча-прававое афармленне сувернітэту і незалежнасці Рэспублікі Беларусь.<br>2. Эвалюцыя грамадска-палітычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь.<br>3. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1994 г.) і першыя выбары Прэзідэнта Республікі Беларусь | 2 | | | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1,2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.4 | **Грамадска-палітычная сістэма Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе**<br>1. Станаўленне прэзідэнцкай формы кіравання ў Рэспубліцы Беларусь. Стварэнне прэзідэнцкай вертыкалі ўлады.<br>2. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2001 г., 2006 г., 2010 г., 2015 г., 2020 г.<br>3. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995 г., 1996 г., 2004 г., 2022 г. | | 2 | | 2 | | [1,2] | Вуснае апытанне |
| 3.5 | **Палітычныя партыі, аб’яднанні і саюзы ў грамадска-палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь**<br>1. Пераход ад аднапартыйнай да шматпартыйнай палітычнай сістэмы.<br>2. Нарматыўна-прававая база дзейнасці палітычных партый, грамадскіх аб’яднанняў і саюзаў.<br>3. Тыпалагізацыя палітычных партый, грамадскіх аб’яднанняў і саюзаў.<br>4. Роля і месца палітычных партый, грамадскіх аб’яднанняў і саюзаў у грамадска-палітычным жыцці Беларусі. | | 2 | | 4 | | [1,2] | |
| 3.6 | **Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь ва ўмовах міравых глабалізацыйных працэсаў**<br>1. Міжнароднае прызнанне суверэннай Рэспублікі Беларусь і змены ў знешняй палітыцы краіны.<br>2. Беларуска-расійскія адносіны. Стварэнне Саюза Беларусі і Расіі.<br>3. Беларусь і СНД. Фарміраванне Мытнага саюза і адзінай эканамічнай прасторы. | 2 | | 2с | 2 | | [1,2] | Абарона паведамленнў |
| 3.7 | **Беларусь у еўрапейскай і сусветнай супольнасці**<br>1. Актывізацыя ўдзелу Беларусі ў дзейнасці ААН.<br>2. Пераход да статуса бяз’ядзернай дзяржавы.<br>3. Курс на паглыбленне інтэграцыйных працэсаў.<br>4. Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.<br>5. Развіццё міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь. | | 2 | | 2 | | [1,2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.8 | **Культура ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту**<br>1. Духоўнае і культурнае жыццё беларускага народа на мяжы XX–XXI стст.<br>2. Гістарычнае мінулае ў творах літаратуры і мастацтва.<br>3. Месца і роль рэлігіі ў духоўным адраджэнні. | | 2 | | 2 | | [1,2] | Абарона прэзентацый |
| 3.9 | **Адукацыя і навука ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту**<br>1. Мадэрнізацыя нацыянальнай сістэмы адукацыі.<br>2. Развіццё і роля беларускай навукі ў сучасным інфармацыйным грамадстве.<br>3. Галоўныя тэндэнцыі і перспектыўныя напрамкі развіцця сучаснай навукі. | | 2 | | 2 | | [1,2] | Абарона прэзентацый |
| | **Усяго** | **24** | **22** | **10 (с.)** | **64** | | | **экзамен** |

## ВУЧЭБНА -МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ (1939 Г. – ПЕРШАЯ ЧВЭРЦЬ XXI СТ.)” (завочная форма атрымання адукацыі)

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | Метадычныя сродкі забяспячэння, дапаможнікі | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | | |
| | **7 семестр** | **6** | **8** | | | |
| 1 | **Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войн 1939–1945 гг.** | **2** | **2** | | | |
| 1.1 | **Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР**<br>1. Гістарыяграфія праблемы.<br>2. Вызваленчы паход Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь.<br>3. Стварэнне органаў улады і працэсс аб’яднання беларускага народа у адзінай дзяржаве.<br>4. Юрыдычна-прававое афармленне ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР. | 2 | | Дакументальны фільм | [1,2] | |
| 1.2 | **Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі ў Беларусі летам 1941 г.**<br>1. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.<br>2. Напад фашысцкай Германіі на СССР.<br>3. Абарончыя баі ў Беларусі летам 1941 г.<br>4. Мабілізацыя ў РСЧА і эвакуацыя насельніцтва з БССР у тылавыя раёны СССР. | | 2 | | [1,2] | Вуснае апытанне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | **Раздзел 2. БССР у пасляваенны перыяд (1944–1985 гг.)** | **2** | **2** | | | |
| 2.1 | **БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе**<br>1. Першы аднаўленчы перыяд у 1943–1945 гг.<br>2. Аднаўленне і развіццё прамысловасці ў БССР у 1946–1955 гг.<br>3. Асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі. Ажыццяўленне калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі ў 1949–1953 гг.<br>4. Грамадска-палітычнае развіццё ў БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг. | 2 | | Дакументальны фільм | [1,2] | Вуснае апытанне |
| 2.2 | **БССР ва ўмовах палітыкі перабудовы. Другая палова 1980-х–пачатак 1990-х гг.**<br>1. Палітыка перабудовы, яе змест і накірункі ажыццяўлення.<br>2. Спроба дзяржаўнага перавароту ў Маскве ў жніўні 1991 г.<br>3. Распад СССР і яго вынікі для сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця Беларусі. | | 2 | | [1,2] | |
| 3 | **Суверэнная Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI ст.** | **2** | **4** | | | |
| 3.1 | **Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь**<br>1. Праблемы і супярэчнасці сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у канцы 1980-х–пачатку 1990-х гадоў.<br>2. Распрацоўка праграмы пераходу да рынкавых адносін. Непаслядоўнасць і неэфектыўнасць сацыяльна-эканамічных рэформ.<br>3. Абвастрэнне эканамічнага крызісу. Заняпад у сацыяльнай сферы. | 2 | | | [1,2] | Вуснае апытанне |
| 3.2 | **Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь у другой палове 1990-х – пачатку 2000-х гг.**<br>1. Распрацоўка і прыняцце праграмы неадкладных мер па вываду эканомікі рэспублікі з крызісу.<br>2. Распрацоўка беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.<br>3. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага эканамічнага развіцця краіны. | | 2 | | [1,2] | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.3 | **Грамадска-палітычная сістэма Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе**<br>1. Станаўленне прэзідэнцкай формы кіравання ў Рэспубліцы Беларусь. Стварэнне прэзідэнцкай вертыкалі ўлады.<br>2. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2001 г., 2006 г., 2010 г., 2015 г., 2020 г.<br>3. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995 г., 1996 г., 2004 г., 2022 г. | | 2 | | [1,2] | |
| | **Усяго:** | **6** | **8** | | | **экзамен** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Гісторыя Беларусі [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», 1-02 01 02 «Гісторыя і сусветная мастацкая культура», 1-02 01 03 «Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа» / склад.: А. Ф. Вялікі [і інш.] // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/249. – Дата доступу: 28.05.2024.
2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэб. дапам. для студэнтаў установ выш. адукацыі / І. А. Марзалюк [і інш.] ; пад агул. рэд. І. А. Марзалюка. – 2-е выд., стэр. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2023. – 447 с.

**Дадатковая літаратура**

1. 1941 год. Страна в огне : ист.-док. изд. : в 2 кн. / Рос. акад. наук, Ин-т всеобщ. истории [и др.] ; редкол.: А. А. Коваленя, В. А. Смолий, А. О. Чубарьян. – М. : Олма Медиа Групп, 2011. – 2 кн.
2. Без срока давности: преступления нацистов и их пособников против мирного населения на оккупированной территории БССР в годы Великой Отечественной войны. Беларусь. Минская область : сб. арх. док. и материалов / Департамент по арх. и делопроизводству М-ва юстиции Респ. Беларусь [и др.] ; сост.: А. Р. Дюков [и др.] ; редкол.: А. К. Демянюк [и др.]. – Минск : Нац. арх. Респ. Беларусь ; М. : Фонд «Историческая память», 2022. – 781 с.
3. Геноцид белорусского народа = Genocide of the belarusian people : информ.-аналит. материалы и док. / Генерал. прокуратура Респ. Беларусь ; под общ. ред. А. И. Шведа. – Минск : Беларусь, 2022. – 174 с.
4. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Соврем. шк. : Экоперспектива, 2007–2011. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / рэд. М. Касцюк. – 2007. – 344 с.
5. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Соврем. шк. : Экоперспектива, 2007–2011. – Т. 6 : Беларусь у 1946–2009 гг. / рэд. У. Навіцкі. – 2011. – 728 с.
6. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; гл. рэд. А. А. Каваленя. – Мінск : Беларус. навука, 2011–2012. – Кн. 2. – 2012. – 656 с.
7. История белорусской государственности : монография : в 5 т. / редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2018–2020. – Т. 4 : Белорусская государственность накануне и в период Великой Отечественной войны и послевоенного восстановления (1939–1953 гг.). – 2019. – 567 с.

8. История белорусской государственности : монография : в 5 т. / редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2018–2020. – 5 т.

9. Конституция Республики Беларусь : с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г., 17 окт. 2004 г. и 27 февр. 2022 г. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2024. – 80 с.

10. Холокост в Беларуси: трагедия и память : док. и материалы / Департамент по арх. и делопроизводству М-ва юстиции Респ. Беларусь [и др.] ; сост.: В. Д. Селеменев [и др.] ; редкол.: А. К. Демянюк (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Колорград, 2022. – 1039 с.

**Пералік заданняў і кантрольных мерапрыемстваў кіруемай самастойнай работы студэнтаў (кср) па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя Беларусі (1939 г. – першая чвэрць XXI ст.)”**

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Коль касць гадзін на КСР | Заданне (па ўзроўню складанасці) | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР | 2 (с.) | **Першы ўзровень**<br>1. Скласці разгорнуты канспект па тэме семінарскага занятку<br>**Другі ўзровень**<br>2. Скласці табліцу з самастойна выбранымі крытэрыямі для параўнання паказчыкаў эканамічнага развіцця БССР і Заходняй Беларусі да ўз’яднання ў 1930-я гг.<br>**Трэці ўзровень**<br>3. Напісаць эсэ.<br>Уявіце сябе ў ролі гарадскога або сельскага жыхара Заходняй Беларусі 1939 г.. Як бы вы паставіліся да падзей восені 1939 г.? Свой адказ запішыце ў выглядзе эссэ | Абарона канспекта<br><br>Абарона творчага задання<br><br>Эсэ |
| 2 | Усенародная барацьба супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Партызанскі і падпольны рух | 2 (с.) | **Першы ўзровень**<br>1. Падрыхтаваць даклад “Героі Мінскага падполля”<br>**Другі ўзровень**<br>2. Падрыхтаваць мультымедыйную прэзентацыю па аднаму з пытанняў семінара (па выбару студэнта)<br>**Трэці ўзровень**<br>3. Падрыхтаваць інтэрактыўную карту “Партызанскі рух на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг)” | Публічнае выступленне і абарона даклада<br><br>Мультымедыйная прэзентацыя<br><br>Інтэрактыўная карта |
| 3 | Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войн | 2 (с.) | **Першы ўзровень**<br>1. Скласці храналагічны летапіс вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў с развернутым каментарыем (у пісьмовай форме)<br><br>**Другі ўзровень** | Абарона творчага задання |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | 2. Падрыхтаваць красворд “Героі вызвалення Беларусі 1943–1944 гг.”<br>**Трэці ўзровень**<br>3. Падрыхтаваць лэпбук “Ваенна-стратэгічная наступальная аперацыя “Баграціён” | Красворд<br><br>Лэпбук |
| 4 | БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе | 2 (с.) | **Першы ўзровень**<br>1. Скласці апорны канспект па праблематыцы семінарскага занятку (па аднаму з пытанняў)<br>**Другі ўзровень**<br>2. З дапамогай гістарычных крыніц падрыхтаваць табліцу “Задачы першых двух пасляваенных пяцігодак” па наступных крытэрыях: мэты, дасягненні, наступствы<br>**Трэці узровень**<br>3. Падрыхтаваць эсэ “Штодзённасць ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе” | Абарона канспекта<br><br>Падрыхтаваць табліцу<br><br>Эсэ |
| 5 | Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь ва ўмовах міравых глабалізацыйных працэсаў | 2 (с.) | **Першы ўзовень**<br>1. Падрыхтаваць гласарый па праблематыцы семінарскага занятку<br>**Другі ўзровень**<br>2. Падрыхтаваць мультымедыйную прэзентацыю на тэму “Міжнароднае прызнанне суверэннай Рэспублікі Беларусь і змены ў знешняй палітыцы краіны”<br>**Трэці ўзровень**<br>3. З дапамогай перыядычных выданняў (газет другой паловы 1990-х – пачатак 2000-х гг.) падрыхтаваць паведамленне аб асноўных этапах развіцця інтэграцыйных працэссаў Беларусі і Расіі і іх выніках | Гласарый<br><br>Мультымедыйная прэзентацыя<br><br>Абарона паведамлення |

**Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці**

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

1. Вусная форма:
– паведамленні,
– вуснае апытанне,
– вусны экзамен,
– абарона прэзентацый,
– абарона творчых праектаў,
– абарона даклада,
– ментальная карта,
– красворд,
– гласарый,
– дыяграмы.

2. Пісьмовая форма:
– тэсты,
– тэрміналагічны дыктант,
– эсэ,
– апорны канспект,
– пісьмовы экзамен.

3. Вусна-пісьмовая форма:
– справаздачы па тэмах аўдыторных семінарскіх заняткаў з наступнай вуснай абаронай,
– справаздачы па самастойнай працы студэнтаў з наступнай вуснай абаронай,
– вуснае апытанне.

## Крытэрыі і паказчыкі ацэнкі выканання форм работы студэнтаў, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе бягучай атэстацыі

| Крытэрыі | Паказчыкі |
|---|---|
| **Даклад** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | - тэма раскрыта;<br>- тэма раскрыта часткова: не больш за 2 заўвагі;<br>- тэма раскрытая часткова: не больш за 3 заўвагі;<br>- тэма не раскрыта: 4 і больш заўваг |
| Аб'ём выкарыстанай навуковай літаратуры | - аб'ём навуковай літаратуры дастатковы;<br>- аб'ём навуковай літаратуры недастатковы: не больш за 2 заўвагі;<br>- аб'ём навуковай літаратуры недастатковы: 3 заўвагі;<br>- аб'ём навуковай літаратуры недастатковы: 4 і больш заўваг |
